*Колькі ж дэпутатаў у заканадаўчым органе Беларусі гавораць па-беларуску? (стар. 2)*
*«Рускі кашмар» вачыма брытанскага журналіста (стар. 3)*

# СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 45.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс 362441

23 студзеня 1996 г. № 4 Кошт свабодны

## Захаранка просіць даць яму магчымасць выступіць на сесіі



**Былы міністр унутраных справаў Юрый Захаранка звярнуўся да старшыні Вярхоўнага Савета Сямёна Шарэцкага з заявою.**

Там, у прыватнасці, гаворыцца: "Указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь я вызвалены ад пасады міністра ўнутраных справаў. Гэтае рашэнне з'яўляецца неабгрунтаваным і пярэчыць Канстытуцыі, якая патрабуе папярэдняй згоды Вярхоўнага Савета. Прашу вас вынесці разгляд гэтага пытання на сесію парламента і даць мне магчымасць выступіць перад народнымі дэпутатамі".

Каментуючы заяву Аляксандра Лукашэнкі аб удзеле Юрыя Захаранкі ў нейкай змове, у якой таксама нібыта ўдзельнічаюць экс-спікер Мечыслаў Грыб і старшыня Канстытуцыйнага суда Валерый Ціхіня, сп.Захаранка адзначыў: "Лічу гэтае выказванне праявою запалення мазгоў і яго ініцыятарам раю прайсці медыцынскае абследаванне. Я і ў страшным сне не мог сабе ўявіць, што пасля выгнання фашызма з нашай шматпакутнай радзімы мне давядзецца жыць у такой дзяржаве, дзе чалавек – зноў усяго толькі пыл пад нагамі".

*СІМ*

## У Першамайскім загінуў беларус

*Падчас штурму занятага чачэнцамі сяла Першамайскае загінуў баец расійскага спецназа, наш зямляк Аляксандр Застаўны.*

Родам ён з вёскі Самойлавічы, што каля райцэнтра Бяроза Брэсцкай вобласці. У расійскі спецназ яго запрасілі пасля тэрміновай службы ў палку аховы маскоўскага Крамля. 30-гадовы Аляксандр Застаўны быў нежанаты. Ён збіраўся ў хуткім часе вярнуцца жыць у Беларусь. Пахаваны ён будзе на радзіме ў аўторак, 23 студзеня.

**С.А.**

## У абарону «Голаса Душы»

**Вернікі просяць вярнуць на Беларускае радыё перадачу "Голас Душы".**

Дзесяткі тысяч подпісаў католікаў сабрана толькі ў Мінску пад лістом на Беларускае радыё. Пра гэта паведаміў стваральнік і аўтар перадачы, настаяцель прыходу касцёла святых Сымона і Алены ксёндз-магістр Уладзіслаў Завальнюк. "Яе слухалі і католікі, і праваслаўныя, і няверуючыя. Пра гэта можна меркаваць па лістах, што прыходзяць на маё імя. І невядомая прычына закрыцця гэтай радыёперадачы. Яна не мела палітычнай накіраванасці, не ўносіла ніякай міжканфесіяльнай розні", – сказаў У.Завальнюк.

Аналагічны збор подпісаў праходзіць у шматлікіх каталіцкіх прыходах Беларусі. Лісты айцу Уладзіславу ідуць з дамоў састарэлых, а таксама з населеных пунктаў, у якіх няма святара.

*БелаПАН*

## У «гарачыя кропкі» зброя дастаўляецца беларускімі самалётамі

**Як стала вядома карэспандэнту СВАБОДЫ, падчас візіту ў Мінск прэзідэнта Казахстана Назарбаева беларускі бок спрабаваў дамовіцца з казахамі аб вызваленні арыштаванага ў Алма-Аты беларускага самалёта.**

Гаворка ідзе пра "Ил-76", які належыць беларускай дзяржаўнай авіятранспартнай кампаніі "Трансавіяэкспарт". 13 снежня 1995 г. гэты самалёт быў арыштаваны спецслужбай Казахстана ў грамадзянскім аэрапорце Алма-Аты, дзе ён вымушаны быў зрабіць пасадку, каб дазаправіцца палівам. На борце беларускага "Ил-76", які рабіў рэйс з балгарскага Плоўдзіва ў афганскі Баграм (40 км ад Кабула), было выяўлена 35 тон боезапасаў (баявых гранат).

У беларускім дзяржкамітэце па авіяцыі даведаліся пра арышт самалёта толькі праз некалькі тыдняў. У сталіцу Казахстана былі тэрмінова камандзіраваныя галоўны юрыст дзяржкамітэта Яўген Нефін, які мае вялікі вопыт следчай работы, і начальнік аддзела бяспекі палётаў Міхаіл Мурашка.

Улады Казахстана інкрымінуюць экіпажу тры рэчы: кантрабанда зброі, уварванне ў паветраную прастору краіны з небяспечным грузам, пасадка самалёта з выбуховымі рэчывамі ў грамадзянскім аэрапорце (побач з самалётам самога Назарбаева!). Цікава, што ў дамове, якую падпісаў генеральны дырэктар "Трансавіяэкспарта", значыліся "народнагаспадарчыя грузы".

Экіпаж і камандзір арыштаванага "Ил-76" нядаўна вярнуліся ў Мінск. Лёс самалёта пакуль што невядомы.

Як сцвярджаюць нашыя крыніцы, мінулым летам беларускія самалёты перавозілі зброю таксама ў Харватыю. Тыя рэйсы былі больш паспяховыя за афганскі.

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

## Пракуратура адмовілася заводзіць справу на прэзідэнта

**Экс-міністр унутраных справаў Юрый Захаранка звярнуўся ў Пракуратуру Рэспублікі з заявай аб узбуджэнні крымінальнай справы супраць А.Лукашэнкі і начальніка ягонай асабістай службы бяспекі Ю.Бародзіча па факту ўзброенага захопу будынка МУС.**

Гаворка ідзе пра падзеі 16 кастрычніка 1995 года, калі ў будынак МУС уварваліся ўзброеныя людзі, якія не пусцілі міністра ў яго рабочы кабінет, зрабілі там вобыск, ускрылі сейф з сакрэтнымі дакументамі, дэманструючы пры гэтым рэальную гатоўнасць прымяніць сілу. Захаранка сцвярджае, што "усё гэта рабілася пад кіраўніцтвам Бародзіча і па загаду прэзідэнта". "Гэтым самым, – лічыць Захаранка, – яны перавысілі свае службовыя паўнамоцтвы, учынўшы злачынства, прадугледжанае крымінальным кодэксам".

Аднак першы намеснік генпракурора В.Кандрацьеў прыняў рашэнне не заводзіць справу на Лукашэнку і яго галоўнага ахоўніка.

У гутарцы з карэспандэнтам СВАБОДЫ Ю.Захаранка сказаў: "Шчыра кажучы, іншага адказу я і не чакаў. Бо трэба мець грамадзянскую мужнасць, каб стаць на бок Канстытуцыі і абараніць закон. На жаль, гэтай чалавечай уласцівасцю валодаюць не ўсе службовыя асобы. Менавіта з прычыны іх беспрынцыповасці мы цяпер апынуліся ў прававым бязмежжы і хаосе".

**Віктар ВАЛАДАШЧУК**

## Ціхіня і Грыб «змоўшчыкамі» сябе не лічаць

**Як вядома, 12 студзеня на закрытым паседжанні сесіі Вярхоўнага Савета А.Лукашэнка паведаміў дэпутатам пра нейкі "заговор", у якім у адной кампаніі з былым міністрам МУС Ю.Захаранкам выступалі старшыня Канстытуцыйнага суда В.Ціхіня і былы спікер М.Грыб.**

Карэспандэнт СВАБОДЫ звязаўся па тэлефоне з В.Ціхінем і М.Грыбам і папрасіў іх пракаменціраваць гэтае абвінавачванне.

Валерый Ціхіня назваў паведамленне пра "заговор" звычайнай "бязглуздзіцай", падкрэсліўшы, што прэзідэнт "жадаемае імкнецца падаць за сапраўднае". "А ўвогуле я не хачу апускацца так нізка, каб нешта гаварыць пра гэта", – сказаў В. Ціхіня.

Мечыслаў Грыб сказаў, што не мае ніякага дачынення да "заговора" і дадаў, што ў яго "нават і ў думках такога не было". Абвінавачванне ён назваў звычайнай "імправізацыяй прэзідэнта".

**Віктар ВАЛАДАШЧУК**

# Ядзерны шантаж Захада – бесперспектыўны шлях

**"Як бы нам зноў не давялося размяшчаць на тэрыторыі Беларусі выведзеную ракетна-ядзерную зброю", – гэтая заява прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, зробленая падчас візіту ў Маскву, выклікала чарговы ўсплёск спрэчак і каментараў.**

Мечыслаў Грыб у сваім каментары СВАБОДЗЕ выказаў занепакоенасць тым, што Беларусь можа зноў аказацца заложніцай процістаяння Захаду і Усходу, калі стане на пазіцыю безумоўнай падтрымкі аднаго з бакоў. Не ўхвалілі метад ядзернага шантажу Захаду таксама Генадзь Карпенка і Пётр Краўчанка. Больш падрабязна на гэтую тэму карэспандэнт СВАБОДЫ пагутарыў з дэпутатам **Анатолем ЛЯБЕДЗЬКАМ.**

– Па-першае, – адзначыў ён, – я быў сярод тых дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання, якія катэгарычна выступалі супраць механізма, які быў прапанаваны для разгляду дагавора СНВ-1. Мы зыходзілі з таго, што ў свеце няма прыкладаў, калі б такое важнае пытанне разглядалася так паспешліва, без аналізу і прагнозу. Мы павінны былі ставіць пытанне аб грашовай кампенсацыі за страты з ракетаў і экалагічныя страты. На жаль, ініцыятыва ў перамоўным працэсе была згубленая, у выніку чаго пацярпелі нашыя нацыянальныя інтарэсы. Гэта быў сіндром "временщиков". Але сёння падобныя заявы проста яшчэ раз сатрасаюць свет і выклікаюць непаразуменне. Такое можа заявіць дзесьці на вёсцы дзядзька Фёдар, які не ведае праблемы, але не лідэр краіны. Таму да свайго каментара я б дадаў, што варта паставіць пытанне і аб адказнасці кіраўнікоў дзяржавы за тое, што яны гавораць. Гэта ў нас ужо прызвычаіліся да розных выказванняў, а ў свеце прыслухоўваюцца да кожнага слова. Упэўнены, на карысць міжнароднаму аўтарытэту Беларусі такія выказванні не пойдуць.

**– Ёсць версія, што Аляксандр Лукашэнка, прыехаўшы ў Маскву, выконвае нейкі абавязковы рытуал, які складаецца з клятваў у адданасці Расіі ды пагроз Захаду...**

– У любым выпадку я не магу пагадзіцца, што рукамі незалежнай краіны Беларусь іншыя краіны вырашаюць свае геапалітычныя задачы. Відома, што інтэграцыйны працэс ідзе і ён адлюстроўваецца ў палітыцы. Але такія мілітарызаваныя заявы, на маю думку, не адпавядаюць сутнасці той інтэграцыі, якая нам сапраўды патрэбная. Трэба зыходзіць з рэалій. Мы маленькая краіна, здольнасці якой уплываць на геапалітычнае становішча ў Еўропе абмежаваныя, таму лепш засяроджваць увагу на эканамічных стасунках. А погляд на сітуацыю з пазіцый шасцідзесяцігадовага генерала Савецкай Арміі, які адчувае за сабой магутнасць ядзернай імперыі, не адпавядае рэчаіснасці. Канешне, свой імідж можна напрацоўваць і пагрозамі свету, як рабіў той жа Садам Хусэйн. Але калі ставіць за мэту, каб пра цябе проста гаварылі, то ўсё ж трэба разумець, да чаго гэта можа прывесці...

**– Вы выключаеце магчымасць, што такім незвычайным захадам прэзідэнт Беларусі спрабуе вярнуцца да праблемы грашовай кампенсацыі Беларусі за ядзерны ўрон?**

– Канешне, мы павінныя ставіць гэтае пытанне: і прэзідэнту, і Вярхоўнаму Савету неабходна ўзнавіць перамоўны працэс па праблеме кампенсацыі. Але рабіць такую справу трэба інакш. Па мерках цывілізаванай палітыкі форма ядзернага шантажу непрымальная і бесперспектыўная. Беларусь на такім шляху аўтарытэту сабе не дадасць.

**Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
23 студзеня 1996 г., № 4

ПАРЛАМЕНТ

# Небяспечная мова?

## *Колькі ж чалавек у заканадаўчым органе Беларусі гавораць па-беларуску?*

Не хочацца лішні раз нагадваць, што ў любой іншай дзяржаве пытанне, вынесенае ў падзагаловак, гучыць па меншай меры абсурдна. Аднак у нас дзяржава спецыфічная, і дэпутаты ў ёй спецыфічныя (асабліва пасля рэферэндуму). Большасць з іх беларускую мову ведае "ў межах, неабходных для ўспрымання" (інакш кажучы, як выхаваны сабачка – усё разумее, а сказаць нічога не можа).

Рыба, як кажуць, гніе з галавы, таму паводзіны старшыні Вярхоўнага Савета ў моўным пытанні адыграюць значную ролю. Сямен Шарэцкі заняў тут, скажам асцярожна, вельмі своеасаблівую пазіцыю. Яго заява пра тое, што пытанні бюджэту ён будзе весці на рускай мове, а праблемы культуры – па-беларуску, выклікае, як мінімум, іранічную заўвагу: а што, калі будуць разглядацца праблемы культуры ў бюджэце?

З аднаго боку, у сваіх інтэрв'ю Шарэцкі захапляецца "Адвечным шляхам" Абдзіраловіча і гаворыць аб неабходнасці нацыянальнай годнасці і культуры, а з іншага – ніхто ад яго пакуль не чуў ані слова па-беларуску: на беларускамоўныя пытанні журналістаў ён адказвае па-руску. Спасылка Шарэцкага на тое, што ён будзе весці сесію па-руску, бо так гаворыць большасць дэпутатаў, выглядае альбо бездапаможна, альбо цынічна. Калі памірае чалавек, можна альбо дапамагаць яму выжыць, альбо нічога не рабіць, паўтараючы "на ўсё воля Бога". Ці, як у нашым выпадку, – "на ўсё воля большасці".

Нават дэпутаты, якія без праблемаў валодаюць беларускай мовай, здаецца, лічаць непатрэбным у пэўных сітуацыях дэманстраваць гэтую сваю якасць. Аляксандр Дабравольскі і Анатоль Лябедзька, акрамя аднаго-двух разоў, выступаюць на рускай мове. Як растлумачыў мне Дабравольскі, яны баяцца, што рэпліка на беларускай мове можа пашкодзіць станоўчаму праходжанню таго ці іншага важнага пытання.

Зрэшты, менш за ўсё хацелася б крытыкаваць "Грамадзянскае дзеянне" – дэпутаты гэтай фракцыі на чале з Багданкевічам пераважна разумеюць важнасць беларускай мовы для самастойнага культурна-палітычнага развіцця нашай краіны. І, наколькі я ведаю, большасць з іх хацела б ёю валодаць, – таму будзем спадзявацца на лепшае. Дарэчы, Генадзь Карпенка першыя свае паведамленні ў якасці намесніка старшыні Вярхоўнага Савета зрабіў па-беларуску.

У Сацыял-дэмакратычнай фракцыі "Беларусь" найбольш паслядоўнымі прыхільнікамі беларушчыны з'яўляюцца два дэпутаты ад Грамады – Пётр Краўчанка і Павел Знавец. Яшчэ на першай прэс-канферэнцыі фракцыі Краўчанка заявіў, што сацыял-дэмакраты будуць адстойваць у парламенце адраджэнцкія ідэі, а астатнія дружна заківалі галовамі. На гэтым іх "адраджэнцкая" функцыя і абмяжоўваецца: лідэр фракцыі Лявон Сечка яшчэ імкнецца часам гаварыць па-беларуску, але іншыя дэпутаты ад СДС у "порочащих" сувязях з беларускай мовай заўважаныя не былі.

Аграрыі, як гэта ні дзіўна, маюць у сваіх шэрагах аднаго дэпутата, які нармальна гаворыць па-беларуску. Астатнія ж прадстаўнікі гэтай фракцыі, відавочна, зрабілі ўсё магчымае, каб ніхто не называў іх ганебным словам "калхознік": гавораць яны ўжо нават не "трасянкай", а амаль чыстай рускай мовай. Засталіся толькі "аграрныя" "г", "ч", і "р" у вымаўленні – а гэта, як паказвае вопыт Лукашэнкі, выправіць нялёгка. Хаця, калі патрэніравацца альбо пахадзіць да лагапеда, апошнія сведчанні свайго беларускага паходжання ўсё-такі ўдасца знішчыць.

Сярод камуністаў знайсці дэпутата з такой унікальнай для гэтых людзей якасцю, як валоданне беларускай мовай, пакуль не ўдалося. Можа, яны і ёсць, але не "свецяцца", – магчыма, баяцца сваіх таварышаў па партыі. Бо для сучасных нашых камуністаў марай з'яўляюцца словы Маякоўскага пра жыццё "без Россий и Латвий", пра што напісаў нядаўна ў прэсе іхні дэпутат Валеры Шчукін. Ідэя наконт "без России" заслугоўвае, канешне, самай сур'ёзнай увагі – цікава толькі, на якой мове ў такім выпадку размаўлялі б беларускія камуністы? Няўжо па-латышску?

Не хочацца лішні раз чытаць натацыі на тэмы культуры і нацыянальнай годнасці. Тым больш што цяпер гэтыя панцці не модныя, замест іх пануе хамства і дэнацыяналізацыя. Цяпер модна блюзнерскае крыўлянне (тыпу: "ня-ма-а рэформаў"), якім прыкрываецца комплекс уласнай інтэлектуальнай непаўнацэннасці. Хочацца, аднак, спадзявацца, што ў большасці дэпутатаў "з комплексамі" ўсё ў парадку, і яны зразумеюць, што глыток уласнай культуры яшчэ нікому не пашкодзіў. Будзем спадзявацца і на тое, што ім захочацца хоць чымнебудзь адрозніваццa ад людзей, якія ненавідзяць усё беларускае...

**Віталь ЦЫГАНКОЎ**

## Парламентарыі запаўняюць дэкларацыі аб даходах

**Дэпутаты Вярхоўнага Савета, якія хочуць працаваць у парламенце на сталай аснове, перад прызначэннем альбо абраннем будуць абавязаныя запоўніць дэкларацыі аб даходах.**

Такую прапанову ўнёс дэпутат Міхаіл Снягір, каб прадухіліць з'яўленне карупцыянераў на кіруючых парламенцкіх пасадах. Ініцыятыву падтрымала парламенцкая большасць. Цяпер, калі ў некага з парламентарыяў, якія пастаянна працуюць у Вярхоўным Савеце, будуць выяўлены не пазначаныя ў дэкларацыі даходы, з'явяцца законныя падставы на вызваленне такога народнага абранніка ад парламенцкай пасады. Дарэчы, згодна закону "Аб службе ў дзяржаўным апараце", перад паступленнем на працу ў дзяржаўныя ўстановы дэкларацыю аб даходах павінны запаўняць усе чыноўнікі. Аднак гэтае патрабаванне практычна паўсюль ігнаруецца.

*СІМ*

## Заробак выплацілі гарэлкай, а штрафы – грашыма

**На Магілёўскім заводзе "Тэхнамаш" работнікам выдавалі заробкі цыгарэтамі і гарэлкай.**

Калі ж людзі пайшлі на кірмаш прадаваць свой "заробак", каб атрымаць колькі грошай, за іх узяліся падатковыя інспектары. Рабочым інкрымінавалася, што гандлююць яны без ліцэнзіі і не плоцяць падатак з атрыманага даходу. Так бедныя прадаўцы свайго заробку засталіся і без яго, ды яшчэ і штрафы мусілі плаціць.

**Іван ЗАСАДА**

# Курс долара вырашылі «ўдасканаліць»

## *Сітуацыя на валютным рынку за мінулы тыдзень гранічна абвастрылася*

**Чуткі аб магчымым падзенні беларускага рубля "ў самы бліжэйшы час", памножаныя на немагчымасць набыць валюту легальным шляхам (праз МВБ), прымусілі кіраўнікоў банкаў і прадпрыемстваў тэрмінова шукаць выйсце з сітуацыі.**

Камерцыйныя банкі кінуліся скупляць наяўную валюту ў насельніцтва, і на працягу тыдня курсы пакупкі долара выраслі да 12.800 – 13.000 рублёў. Прадпрыемствы пачалі ў спешным парадку перакачваць безнаяўныя беларускія рублі ў наяўныя долары. І тут дэфіцыт выклікаў астранамічны рост курсаў. Хутка ўспрыняўшы новую сітуацыю, аператары наяўнабезнаяўнага рынку давялі кацiроўкі пакупкі долара да 13.000 –15.000, а продажу – да 18.000 – 20.000. У гэтыя дні сектар продажу наяўных грошай зноў успомніў пра былыя прыбыткі, што былі там падчас высокай інфляцыі і пастаяннага росту курса долара.

Звесткі аб уядзенні валютнага калідора патушылі ажыятаж, і каціроўкі долара пачалі вяртацца ў звыклыя межы. Аднак разам з гэтымі звесткамі прыйшла і навіна аб уядзенні 10-працэнтнага падатка на куплю валюты на МВБ. Падатак створаны для падтрымкі прадпрыемстваў-экспарцёраў. Мэта высакародная. Аднак тым жа экспарцёрам валюта неабходная для закупкі за мяжой сыравіны, камплектуючых і запасных частак, абсталявання і інш. Мала таго, што новы падатак выкліча чарговы рост цэнаў на імпартуемыя ў краіну тавары, ён можа зрабіць прадукцыю тых жа прадпрыемстваў-экспарцёраў канчаткова неканкурэнтаздольнай. Па ланцугу праблемы са збытам вырастуць і ў тых прадпрыемстваў, што пастаўляюць ім матэрыялы і камплектуючыя.

Следам за гэтым для пэўнай групы таваравытворцаў трэба будзе ўводзіць разнастайныя папраўкі і ўдакладненні да ўказа, рэжымы "садзейнічання і спрыяння", што створыць чарговыя праблемы для суб'ектаў гаспадарання краіны.

Такім чынам, новы ўказ "Аб некаторых мерах па ўдасканаленню грашова-крэдытнай палітыкі" у чарговы раз пацвярджае той факт, што ўдасканаленне ў разуменні нашага прэзідэнта – гэта толькі абмежаванне і забарона.

Напэўна, ужо ўсе, акрамя яго, ведаюць, што чым вышэйшы ўзровень падаткаў у краіне, тым меншы памер паступлення гэтых самых падаткаў у бюджэт. І тут не выратуюць ніякія карныя меры – капітал проста сыйдзе з беларускай арэны. Туды, дзе падаткі ніжэйшыя.

Ці так трэба ўдасканальваць?

**Сяргей ФЛАРЫЯНАЎ**

# Кожнаму працоўнаму – свой магазін, свой тралейбус, сваю лазню

**На Мінскім падшыпнікавым заводзе знайшлі выдатнае выйсце з фінансавага тупіка: з чарговага заробку працоўным выплацілі толькі пэўную суму (прыкладна паўмільёна), а астатняе залічылі на асабісты рахунак, грошы з якога можна атрымаць толькі ў дзвюх заводскіх крамах.**

У адной з гэтых крамаў прадаюць прамысловыя тавары. Асартымент невялікі. Можна набыць тэлевізар "Гарызонт" за мільён сямсот тысячаў (такі ж самы ў гарызонтаўскай фірмовай краме каштуе мільён сто) ці бензапілу або кухонныя прылады. Але жадаючых купляць тыя ж кухонныя прылады ўсё менш, бо людзям хутка не будзе чаго есці: у прадуктовай краме хлеба ці малака часцей няма, за мясам чэргі, затое без праблем можна набыць гарэлку.

Працоўныя ў разгубленасці. Як пражыць, калі трэба заплаціць і за кватэру, і за святло, і за праязны білет, ды нават за білет у тую лазню? Ці, можа, хутка кожнага працуючага на "падшыпніках" замацуюць не толькі за асобнай крамай, але і за асобным тралейбусам, за асобнай лазняй і гэтак далей?

Калі працоўныя прадпрыемства сустракаюцца з кіраўнікамі, то чуюць ад іх: радуйцеся, што хоць такое выйсце знайшлі, магло быць і горш. Сапраўды, бывае стан і горшы за прыгоннае права. Яго назва – рабства.

**Алесь ПАЎЛОВІЧ**

# Беларускія літоўцы пішуць Бразаўскасу

**Літоўцы з вёскі Рымдзюны Астравецкага раёна звярнуліся пісьмова да прэзідэнта Літвы А.Бразаўскаса. Яны занепакоеныя лёсам літоўскага культурнага цэнтра, які будуецца ў іхняй вёсцы з 1990 года.**

Грошы на яго тады выдзеліў літоўскі ўрад. Будаваць пачалі актыўна, але пазней стала не хапаць сродкаў і будаўніцтва амаль спынілася.

Летась два прэм'еры – А.Шляжавічус і М.Чыгір – дамовіліся супольна фінансаваць будоўлю. Было таксама вырашана, што ўжо гатовыя будынкі і тыя, што яшчэ будуюцца плюс грашовыя сродкі, выдаткаваныя літоўскім бокам, перадаюцца ў распараджэнне цэнтральнай арганізацыі – Беларускай рэспубліканскай грамады (абшчыны) літоўцаў. Здавалася б, лепш і не прыдумаеш.

І вось адбылася досыць цікавая падзея – літоўская абшчына накіравала ліст ураду Літвы з прапановай наконт выкарыстання "пабудоў у вёсцы Рымдзюны ў выпадку іхняй перадачы на баланс абшчыны". Што ж прапаноўваецца? Закончыць і здаць у эксплуатацыю школу. Далей. Жылыя памяшканні прадаць, а грошы вярнуць у казну Літвы. Клуб – здаць у арэнду. Дом для старых "выкарыстоўваць па прызначэнні". Падмуркі для басэйна дэмантаваць. Пякарню прадаць, а грошы вярнуць Літве. Адмовіцца ад будаўніцтва маста. Амбулаторыю таксама не будаваць.

А далей прапановы яшчэ цікавейшыя. Магазін – прадаць, а атрыманыя грошы "вярнуць літоўскаму народу" (!?). Аўтавакзал – не перабудоўваць, а дарогу – не асфальтаваць, як гэта планавалася. І, нарэшце, самае "выдатнае" – "Пошту і тэлеграф – не браць"! Так і напісана. Карацей, як у 1917 годзе, толькі наадварот.

Даведаўшыся пра планы свайго сталічнага начальства, рымдзюнаўскія літоўцы самі склалі ліст да А.Бразаўскаса і ўрада Літвы. Яны, у прыватнасці, пішуць: "Нас палохае намер перадаць цэнтр Беларускай (Мінскай) абшчыне, каб тая памагла яго распрадаць з мэтаю нажывы. Наконт гэтага ў нас ёсць дакладныя звесткі... Не пакідайце нас на волю лёсу!"

Нагадаем, што ў Астравецкім раёне, побач з літоўскай мяжой, літоўцы жывуць здаўна. Дасталося ім ад розных уладаў – царскіх, польскіх, савецкіх. Але яны, незважаючы на перашкоды, захавалі сваю нацыянальную адметнасць. І вось для іх з'явілася магчымасць пажыць па-людску, займець для ўсіх іншых навакольных вёсак, дзе жывуць літоўцы, не толькі вялікі культурны цэнтр, але таксама і новыя працоўныя месцы. Аднак кіраўніцтва рэспубліканскай абшчыны, седзячы ў Мінску, вырашыла: хопіць вам і дома для старых, інакш кажучы, вымірайце сабе паціху.

Чым жа кіруюцца ў сталіцы, жадаючы, па-сутнасці, скасаваць напалову скончаны цэнтр? Старшыня рэспубліканскай абшчыны В.Тарнаўскайтэ, тэатральны рэжысёр, напрыклад, лічыць магчымым і мэтазгодным прадаць цэнтр у Рымдзюнах і набыць памяшканне ў Мінску. Пры гэтым яна спасылаецца на "меркаванне прадпрымальнікаў літоўскага паходжання". У гэтым, мабыць, і ўся сутнасць. Бо кошт ужо пабудаванага ў Рымдзюнах ацэньваецца прыблізна ў два мільёны долараў! Можна ўявіць, якія перспектывы чакаюць тады тых прадпрымальнікаў, калі ўсё гэта "прадаць і вярнуць літоўскаму народу"...

На Гродзеншчыне жыве нямала літоўцаў, ёсць цэлыя літоўскія вёскі, існуе свая абласная абшчына. Аднак, паводле статута агульнанацыянальнай абшчыны літоўцаў, ніхто з правінцыялаў голаса не мае. За іх, як гэта рабілася заўжды, усё вырашаюць у сталіцы. І, як звычайна, на карысць саміх сталічнікаў.

**Алесь НАРБУТ**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
23 студзеня 1996 г., № 4

# Калі ж мы пазбавімся варожасці да салдацкіх магіл?

## *Першае перазахаванне парэшткаў нямецкіх салдат зроблена каля Святога возера*

*Сям'я Гены Ціханава захоўвае дома парэшткі нямецкіх салдат, выкапаныя на гародзе*

**Здымак Валерыя БЫСАВА**

У Міністэрстве замежных справаў рыхтуецца беларуска-германскае пагадненне аб нямецкіх вайсковых пахаваннях, якое падпішуць Упраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў айчыны і ахвяраў вайны пры Міністэрстве абароны Беларусі і Народны саюз Германіі па доглядзе за вайсковымі могілкамі.

Начальнік упраўлення МЗС Віктар Чайчыц паведаміў, што міністэрства атрымала з Германіі праект пагаднення. Згодна з ім, мяркуецца вызначыць каля 100 участкаў, дзе знайшлі апошняе супакаенне нямецкія салдаты абедзвюх сусьветных войнаў. Народны саюз просіць, каб беларуская дзяржава ўзяла гэтыя месцы пад ахову. Акрамя таго, пэўная частка палеглых будзе перанесена на цэнтралізаваныя могілкі ў абласных цэнтрах, будаўніцтва якіх прафінансуе нямецкі бок. Да справы далучацца не толькі фірмы з Германіі, але і нашыя гаспадарчыя арганізацыі.

Нямеччына мае падобныя пагадненні практычна з усімі еўрапейскімі краінамі (нават з Расіяй), дзе загінулі салдаты Вермахта. Засталіся Украіна і Беларусь. Віктар Чайчыц лічыць, што "падпісаць дакумент можна хутка, але гэта далікатная справа. Не ўсе ветэраны ў Беларусі адэкватна рэагуюць. У нас яшчэ шмат пахаванняў з невядомымі савецкімі салдатамі. Трэба ўсё рабіць па-людску, каб не было крыўдна за магілы савецкіх салдат, якія таксама неабходна добраўпарадкаваць". (Тут міжволі ўзнікае пытанне: навошта было траціць мільярды рублёў на пампезнае святкаванне 50-годдзя перамогі, калі не хапае грошай, каб мёртвым аддаць належнае?)

Пошукам пахаванняў савецкіх, а таксама нямецкіх салдат займаецца Упраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў айчыны і ахвяраў вайны, створанае паводле прэзідэнцкага ўказу. Яму падпарадкоўваецца рота (каля 200 салдат). Начальнік упраўлення Мікалай Ешчанка адзначыў: "Калі трапляюцца парэшткі нямецкіх салдат, то іх не выкідваюць, а перадаюць мясцовым арганізацыям (ваенкаматам ці выканкамам) альбо прыкопваюць і пазначаюць месца на мапе".

Спецрота часта ідзе па слядах марадзёраў альбо "общественников" (з усяго былога СССР), якія "няграматна, нецывілізавана, незаконна займаліся раскопамі". Пакуль што за гэта пакараць можна толькі штрафам, але Міністэрства юстыцыі рыхтуе іншыя артыкулы. Аднак ці можна абвінавачваць цяпер той жа юнацкі клуб з Оршы, які падчас небяспечных раскопаў на палях баёў збіраў медальёны нямецкіх салдат. Дзякуючы такім "общественникам" удалося зрабіць крокі да прымірэння.

Як падкрэсліў карэспандэнту СВАБОДЫ Мікалай Ешчанка, "зараз выключна наша ўпраўленне мае права шукаць парэшткі, жэтоны і медальёны нямецкіх салдат." Таму зусім верагодна, што справа можа зацягнуцца. Начальнік упраўлення сказаў, што "не маюць шанцаў тыя, хто чакае атрымаць мяшок дойчэмарак за раскапаныя медальёны. Нямецкі бок цікавіцца найперш, дзе ляжаць парэшткі і каму яны належаць. Хаатычнае калупанне зямнога шару нікому непатрэбнае".

Увесну рота зноў возьмецца капаць. А зараз працягваецца пошук матэрыялаў у музеях, архівах, ідзе апытанне мясцовых жыхароў. Пачынаючы з мая мінулага года, рота далакопаў (як іх празвалі ў народзе) перабрала нямала костак і чарапоў. А ў Круглянскім раёне Магілёўскай вобласці, непадалёк ад Святога возера, яна зрабіла першае перазахаванне парэшткаў нямецкіх салдат. Як сказаў старшыня Шэпелевіцкага сельсавета, каля Святога возера апошні спачын знайшлі 17 салдат Вермахта. Магілу абгарадзілі і паставілі крыж. Да самой акцыі мясцовыя жыхары паставіліся з разуменнем. Парэшткі сямі савецкіх салдат перазахавалі на цэнтральнай сядзібе мясцовага саўгаса. Аднак далакопы не знайшлі ў Круглянскім раёне ніводнага медальёна (нехта, відаць, сабраў раней). Ідэнтыфікаваць парэшткі ўдалося дзякуючы асобным прадметам, зброі і г.д.

Мікалай Ешчанка адзначыў, што парэшткі нямецкіх салдат могуць вывозіцца ў Германію толькі са згоды іх родных. А вось парэшткі італьянскіх салдат, якіх у Беларусі выяўлена каля 600 (ёсць могілкі ў Глыбоцкім раёне), абавязкова вывозяцца на радзіму. Першая частка ўрнаў ужо адпраўленая ў Італію.

Як паведамілі карэспандэнту СВАБОДЫ ў пасольстве ФРГ у Мінску, грамадзяне Беларусі атакуюць дыпламатаў пытаннямі, што рабіць са знойдзенымі парэшткамі ці медальёнамі палеглых салдат, ці просяць, каб Народны саюз іх забраў. Падобны ліст атрымала і рэдакцыя СВАБОДЫ. "Генадзь Ціханаў, гаспадар дома №17 па вуліцы Вакзальнай у Крычаве, у сябе на ўчастку браў гліну і знайшоў парэшткі 5 нямецкіх салдат і медальёны. Ён зрабіў труну і ўжо паўгода захоўвае іх дома". Нягледзячы на шматлікія звароты ў амбасаду, лісты да Гельмута Коля, да Народнага саюза, парэшткі ніхто не забірае. Аднак Генадзь Ціханаў "перадасць іх толькі нямецкаму боку пасля атрымання гарантый аб пераносе ягонага дома з нямецкіх могілак". Бо, як высветлілася пазней, дом Ціханавых, а таксама суседнія хаты стаяць на костках.

Але наўрад ці зможа Германія перапраўіць з Беларусі, а таксама іншых краін СНД, парэшткі каля 2,2 мільёна палеглых нямецкіх салдат. Застаецца даць ім на нашай зямлі вечны спакой, які атрымалі савецкія салдаты ў Германіі. А замест раскопаў моладзь возьмецца даглядаць пахаванні як савецкіх, так і нямецкіх салдат. У вёсцы Тарасава, непадалёк ад Мінска, ужо працаваў маладзёжны нямецка-беларускі лагер. Арганізатар лагера з нямецкага боку 54-гадовы Зігурд Кведнаў, былы лётчык Бундэсвера, заўважыў: "Ні нас, ні гэтых маладых людзей нельга рабіць адказнымі за жахі Другой сусветнай вайны. Але наша моладзь адказвае за тое, як яна абыходзіцца з гісторыяй".

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

# «Рускі кашмар» вачыма брытанскага журналіста

*Пра тое, што адбываецца ў Чачні, большасць беларусаў даведваецца з расійскіх інфармацыйных крыніц. Звычайна ў праграме навін яны абмяжоўваюцца пералікам стратаў з абодвух бакоў і выказваннямі, «як федэральныя войскі наводзяць у рэспубліцы парадак». Што ж сапраўды там адбываецца?*

Нядаўна я праглядаў англійскі тэлеканал *BBC* і мне пашэнціла паглядзець перадачу, дзе брытанскі журналіст Ангус Роксбург паказвае і распавядае пра тое, што ён бачыў у Чачні. *"Russian Nightmare"* ("Рускі кашмар" – так называецца фільм) пабудаваны на рэальных фактах і сведчаннях людзей, з якімі непасрэдна размаўляў журналіст.

Размова пачынаецца з чачэнцам, які спрабаваў супрацоўнічаць з рускімі ўладамі. Як вядома, сталіца Чачні Грозны кантралюецца федэральнымі войскамі, але што гэта за кантроль, становіцца ясна пасля. "Уначы Грозны, відаць, адзін з самых небяспечных гарадоў у свеце, – кажа суразмоўца. – Але не столькі шкоды прыносяць снайперы-дудаеўцы, як рускія вайскоўцы. Яны напіваюцца і пачынаюць страляніну, часта паміж сабою. Над імі няма ніякага кантролю. Як пасля гэтага можна ім давяраць".

Сапраўды, пасля таго, што зрабіла рускае войска з Грозным, нават мясцовае рускае насельніцтва варожа ставіцца да "вызваліцеляў". У тых, хто застаўся ў жывых, да канца дзён застанецца ў памяці бамбардзіроўка рускай авіяцыяй Грознага ў снежні 1994 г. Гісторыкі лічаць, што гэта была самая жахлівая бамбардзіроўка пасля Другой сусветнай вайны. У выніку "ўстанаўлення канстытуцыйнага парадку" горад застаўся ўшчэнт разбураны, а руіны будынкаў жыхары называюць "рускай гуманітарнай дапамогай".

Я не бяруся апісваць стан маці-чачэнкі, якая расказвала брытанскаму журналісту пра тое, як падчас бамбардзіроўкі бомба патрапіла ў яе дом, забіўшы шасьцёх дзяцей. Двое засталіся жывымі – адна дзяўчынка параненая асколкам у пазванок, другая – у пах і ніжнюю частку жывата.

Ангус Роксбург сустракаўся таксама з хлопчыкам Жэнем, на вачах якога год таму забілі ягонага дзядулю. "Мы ішлі па вуліцы, – кажа ён, – калі раптам наляцелі самалёты. Дзядуля супакойваў мяне, што яны не будуць бамбіць, але пачалі падаць бомбы". Хлопчык паспеў адбегчы і схавацца, а дзеда на месцы забіла асколкам. Для Жэні гэта была вялікая псіхалагічная траўма. Брытанскі журналіст перабірае ў руках асколкі ад розных снарадаў, а Жэня тлумачыць яму, з якой гарматы яны былі пушчаныя і што яшчэ са зброі можна знайсці на вуліцы.

Вельмі здзівіла аўтара і геаграфія бомбавых удараў. Перад аб'ектывам праплываюць шыкоўныя асабнякі некаторых прамаскоўскіх уплывовых асобаў. Будаўнікі, якія працуюць у рамках праграмы па аднаўленні Грознага, ужо каторы дзень не працуюць з-за таго, што няма сродкаў і матэрыялаў на дом для ветэранаў. У той жа час яны паказалі на дом міністра будаўніцтва Чачні. Гледзячы на яго катэдж, застаецца толькі парадавацца за міністра. Але, каб паказаць, што дзяржава рупіцца і пра просты люд, яна выдала Таіце Абубакаравай, жыхарцы Грознага, за ўшчэнт разбураны дом аж 1.000.000 рублёў.

Нельга казаць, што гэта вайна – вайна паміж рускім і чачэнскім народамі. З простага насельніцтва гіне столькі ж чачэнцаў, колькі і рускіх. Рускія жанчыны, якія сабраліся вакол журналіста, гаварылі, што ніхто нікога не прыніжаў і не крыўдзіў – і рускія, і чачэнцы жылі як добрыя суседзі. Але пасля ўводу "акупацыйных войскаў" (так яны называлі федэральныя войскі) адносіны паміж нацыянальнасцямі моцна ўскладніліся.

Вайна – гэта смерць, для якой няма розніцы, якой ты нацыянальнасці. Камера апаратара паказвае могілкі: чачэнскія побач з рускімі. У асобных месцах ляжаць кучы непахаваных целаў. Палова з іх ужо разлажыліся. Пахаваць іх належным чынам няма магчымасці – адсутнічаюць сродкі, а родныя не могуць ідэнтыфікаваць целы, бо яны да непазнавальнасці пашкоджаныя. Для таго, каб людзі маглі знайсці парэшткі сваіх блізкіх, створана спецыяльная недзяржаўная група. Яе ўзначальвае Хусейн Хамідаў. Ён пачаў сваю дзейнасць, калі з дому выйшлі два яго сыны і больш не вярнуліся. Праз некалькі дзён ён выцягнуў іх трупы з ямы, дзе былі зваленыя мёртвыя. Пасля ён знайшоў яшчэ 66 такіх ямаў, дзе знаходзілася каля 800 целаў. На многіх з іх былі сляды катаванняў. Хамідаў паказаў труп жанчыны з адрэзанай галавой, вочы і рот былі заклееныя пластырам.

Як "кантралюецца" Грозны рускімі войскамі, шмат яшчэ змогуць расказаць канцэнтрацыйныя лагеры ("фільтрацыйныя пункты", як называюць іх расійскія ўлады і, у прыватнасці, спадар Лобаў, афіцыйны прадстаўнік Масквы ў Чачні, які адобрыў існаванне такіх цэнтраў). У такім месцы чалавек можа прабыць каля месяца без усялякіх абвінавачванняў толькі за тое, што ён чачэнскай нацыянальнасці. Брытанскага журналіста не пусцілі ўнутр лагера, але ён знайшоў чалавека, які пабываў у "фільтрацыйным пункце". "За кожным замацаваны свой кат, а ў кожнага ката – свой спосаб катавання, – гаворыць Ібрагім. – Напрыклад, майму знаёмаму тушылі на целе папяросы. Мне паміж пальцаў на руцэ ўстаўлялі алоўкі ці што-небудзь падобнага кшталту і потым сціскалі рукі... Потым яны білі мяне токам, аблівалі халоднай вадой і пачыналі ўсё спачатку. Яны ў мяне нават нічога не пыталіся – усё рабілі толькі дзеля катавання".

Давялося Ангусу Роксбургу сустрэцца і з Джахарам Дудаевым, які заявіў, што будзе весці вайну да канца і плануе "перакінуць баявыя дзеянні на тэрыторыю ворага (Расіі)" "У нас ёсць неабходныя людзі і сродкі", – заявіў Доку Махаеў, адзін з рэгіянальных камандзіраў.

Хто ж тыя людзі, што сталі на бок Дудаева? Сярод іх шмат простых людзей, якія раней былі настаўнікамі, бухгалтарамі, дактарамі. Мяркуючы па размовах з імі, нельга сказаць, што гэта задураныя нейкімі дзядзькамі небаракі – кожны з іх бачыць Чачню вольнай і незалежнай. Разыта Разаналіева, лектар універсітэта, сказала брытанскаму журналісту (дарэчы, па-англійску), што "мы ніколі не зможам жыць з рускімі разам. Занадта розныя мы нацыі".

Фільм заканчваецца кадрам, дзе над высокім будынкам лунае чачэнскі нацыянальны сцяг, на якім выявы месяца і ваўка, а пад імі –бел-чырвона-белая паласа. Як растлумачыла Разыта Разаналіева, гэты сцяг гаворыць, што на чачэнцаў заўсёды ідзе паляванне, як на ваўкоў, але перамагчы іх немагчыма.

**Дзмітрый ДАРОХІН**

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Колькі каштуе дзявочая годнасць?

**У Баранавічах адбыўся незвычайны судовы працэс, які разгледзеў зыск прадаўшчыцы аднаго з малых прадпрыемстваў горада да Баранавіцкага медыцынскага тэрытарыяльнага аб'яднання № 1.**

У зыскавай заяве яна сцвярджала, што падчас медыцынскага агляду дактары па неасцярожнасці пазбавілі яе "нявіннасці". За нанесены маральны ўрон пацярпелая запатрабавала спагнаць з медыкаў 5 мільёнаў рублёў. Суд прызнаў яе патрабаванні абгрунтаванымі і задаволіў зыск.

**Ігар БАРАНОЎСКІ**

## Забойца расстраляны

**Прыгавораны да смяротнага пакарання і ўжо растраляны жыхар Дрыбінскага раёна Сцяпан Пашкоў.**

Ён быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання за жахлівае забойства трохмесячнай дзяўчынкі Веранікі. Адбылося гэта на хрэсбінах немаўляткі, дзе Пашкоў быў госцем. Пасля некалькіх шклянак гарэлкі ён раптам схапіў дзяўчынку і з размаху стукнуў яе галавой аб падлогу. Вераніка загінула. Экспертыза паказала, што забойца не меў псіхічнай хваробы, а быў проста п'яны.

**Сымон ГЛАЗШТЭЙН**

## Адстрэл старшыняў працягваецца

**У Быхаве адбыўся замах на старшыню мясцовага райспажыўсаюза Красніцкага.**

Ён атрымаў кулявое раненне ў спіну, калі ішоў раніцай на працу. Прычым, стрэлу ніхто не пачуў. Куля прабіла два пазванкі. Следства шукае злачынцаў.

**Іван ЗАСАДА**

## Паляванне на «бамжоў»

**Магілёўская міліцыя нядаўна правяла рэйд з мэтай праверкі так званай жыццядзейнасці людзей без акрэсленага месца жыхарства.**

Высветлілася, што бамжоў, якія жывуць паўсюль — у пад'ездах, падвалах і нават ў люках цеплатрасы, сёння шмат. Спяць яны на дошках, гатуюць ежу пры дапамозе розных прылад. У асноўнай масе гэтыя людзі жывуць за кошт сваіх крымінальных учынкаў. У час рэйда міліцыянеры затрымалі 16 чалавек. Трое з іх прыцягнутыя да адказнасці за дробнае хуліганства, адзін знаходзіцца пад наглядам праваахоўных органаў.

**Аляксандра ПРОНЬКІНА**

## Скралі карціну Шагала

**Як паведаміла віцебская газета "Народнае слова", у Тэль-Авіве з выставы скралі карціну Марка Шагала "Лесвіца Якава".**

Па ацэнцы эксперта ў карціна, якая была намалявана напрыканцы 50-х гг., каштуе 200—260 тысяч нямецкіх марак.

**Васіль КРОКВА**

# «Плацінавая справа» пахне ўранам

**Пакуль безвынікова ідзе пошук трох афіцэраў, якія зніклі з базы ракетнай тэхнікі ў пасёлку Коласава Стаўбцоўскага раёна, прыхапіўшы з сабою каштоўныя металы больш як на 100 тысяч долараў.**

Вайсковая пракуратура выйшла на факт знікнення 7,8 кг плаціны пасля таго, як быў затрыманы начальнік штаба базы падпалкоўнік Г.Лабко, які падазраецца ў крадзяжы цітана і алюмінія. На наступны дзень пасля яго арышта была прызначана праверка базы следчымі вайсковай пракуратуры, але камандзіры чакаць не сталі і ўдарыліся ў ногі. Зніклі палкоўнік Уладзімір Жыхараў, маёр Генадзь Давідовіч ды капітан Генадзь Мурын. Аб месцы іх знаходжання выказваюцца самыя розныя версіі. Не выключаны і горшы для дээзерціраў варыянт – на думку вайсковых следчых, збыць столькі каштоўнага металу без дапамогі мафіі немагчыма, а яны рызыкаваць не любяць.

Усе трое зніклых афіцэраў маюць сем'і і дзяцей. Сям'я Жыхарава жыве нават ў Мінску, дзе адзін з яго сыноў вучыцца ў Суворашскім вучылішчы. Дзве дачкі-школьніцы ў маёра Давідовіча, а ў капітана Мурына трохгадовы сын, маці якога памерла падчас родаў.

Увогуле тое, што здарылася на 25-м арсенале – даволі тыповая з'ява, на думку спецыялістаў. Зусім нядзіўна, што камандзіры базы пачалі красці каштоўныя ды каляровыя металы: сыход расейскіх ракетчыкаў праходзіў ва ўмовах бескантрольнасці. Ламалася абсталяванне, прыводзіліся ў непатрэбны стан памяшканні, многа чаго прадавалася направа і налева як салдатамі, так і афіцэрамі. Змена гаспадара базаў (савецкую армію змяніла расейская, а зараз – беларуская) крыху запаволіла гэты працэс, але не спыніла яго. Як высветлілі следчыя, крадзеж тых жа плацінавых кантактаў, якіх на арсенале было калісьці 5 тысячаў (!), працягваўся з пераменным поспехам каля пяці гадоў. Не выключана, што праверкі, якія цяпер праводзяцца і ў іншых былых арсеналах расейскіх ракетаў на тэрыторыі Беларусі, высветляць не адно новае злачынства.

Хто яшчэ ў чарзе на раптоўнае знікненне і ці не прыхопяць новыя ўцекачы разам з каляровымі металамі пісталеты ці нават ракеты?

**Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ**

## У банку знайшлі гранату

**У Брэсце падчас рамонту будынка аддзялення Нацыянальнага банка, які знаходзіцца паміж аблвыканкамам і Упраўленнем КДБ, спатрэбілася дапамога сапёраў.**

Рабочыя, што працавалі ў падвальным памяшканні банка, знайшлі ў вапнавым растворы падазроны прадмет, які сапёры кваліфікавалі як "граната Ф-1 часоў апошняй вайны". Небяспечная знаходка была вывезеная сапёрамі за горад і абясшкоджана. Міліцыя лічыць, што хутчэй за ўсё у вапнавы раствор граната трапіла разам з пяском з кар'еру.

**Ігар БАРАНОЎСКІ**

## Самагубцаў стала больш

**Па дадзеных упраўлення магілёўскай міліцыі, ў 1995 годзе 360 жыхароў вобласці скончылі жыццё самагубствам.**

На гэты ўчынак рашаюцца не толькі людзі з нездаровай псіхікай, але і тыя, хто не здолеў знайсці выхад з цяжкага жыццёвага становішча, у якое патрапіў.Чарговае самагубства нядаўна зафіксаванае ў Бабруйску. Беспрацоўны мужчына выкінуўся з вакна ўласнай кватэры 9-павярховага дома.

**Аляксандра ПРОНЬКІНА**

## «Здалі» дырэктара

**Гарадская пракуратура Пінска выдала ордэр на арышт дырэктара спартыўнай школы Аркадзя Шыпіцыеўскага.**

Падставай для гэтага стала калектыўная скарга, якую падалі ў пракуратуру падначаленыя кіраўніка. Шыпіцыеўскі падазраецца ў прысваенні часткі даходаў, якія атрымлівала спартшкола ад гаспадарчай дзейнасці асобных службаў. Свае дзеянні дырэктар тлумачыў тым, што летась у касе школы была выяўлена нястача грошай, якую ён пакрыў з уласнай кішэні, і таму ён мусіў кампенсаваць сабе выдаткі.

**Ігар БАРАНОЎСКІ**

Вы любіце СВАБОДУ,
маеце вольны час і хочаце зарабіць?
**Наша газета можа заключыць з вамі дамову на распаўсюджванне СВАБОДЫ**
ТЭЛЕФАНУЙЦЕ:
●Мінск 36.24.41
●Брэст 26.47.13
●Гродна 45.41.83
●Магілёў 22.63.19
●Орша 4.28.57

СПОРТ

# Вараб'ёў узлятае вышэй за арлоў

**ФРЫСТАЙЛ**

Упершыню беларус Васіль Вараб'ёў стаў пераможцам этапа Кубка свету ў акрабатычных скачках з трампліна ў Блэкэнрыджы (штат Каларада, ЗША). За тыдзень перад гэтым Вараб'ёў падняўся на трэцяе месца. І вось ён – першы!

**СКАЧКІ НА ЛЫЖАХ**

Рэдкі выпадак адбыўся на спаборніцтвах лыжнікаў у Сапара (Японія). Алімпійскі чэмпіён аўстрыец Андрэас Гольдбергер і лідэр Кубка свету фін Ары-Пекка Нікала набралі аднолькавую колькасць ачкоў і падзялілі першае месца.

**ХАКЕЙ**

У Бостане (ЗША) адбыўся традыцыйны матч зборных Заходняй і Усходняй канферэнцый НХЛ. За 38 секунд да канца паядынка абаронца "Усхода" Рэй Бурк ("Бостан Бруінз"), які 14 (!) раз прымаў удзел у матчы зорак, паставіў пераможную кропку – 5:4. Вялікія Марыё Лем'ё ("Усход"), Уэйн Грэцкі, расіяне Сяргей Фёдараў і Аляксандр Магільны (усе – "Захад") абмежаваліся кожны галявой перадачай.

Капітан "Дэтройт Рэд Уінгз" Сціў Айзерман стаў 22-ім у гісторыі НХЛ хакеістам, які закінуў не менш за 500 шайбаў у вароты супернікаў.

А лідэр у спаборніцтве бамбардзіраў Марыё Лем'ё ("Пітсбург Пінгвінз") дасягнуў мяжы ў 100 ачкоў (40 галоў + 60 выніковых перадачаў). І гэта ў 45 матчах!

А ў нас, як і раней, расчароўвае заўзятараў "Цівалі". Чарговыя паразы ў чэмпіянаце МХЛ (другая група) мінчане пацярпелі дома ад кіеўскага "Сокала" – 2:5 і ў гасцях ад ЦСКА – 0:4.

Затое ва Усходне-Еўрапейскай хакейнай лізе гродзенскі "Нёман", двойчы абыграўшы "Энергію" з літоўскага Электрыная – 5:2 і 7:3, лідэрам завяршыў першы этап спаборніцтваў. Цяпер каманды падзеляцца на дзьве чацьвёркі і будуць змагацца ў вузкім коле. У мацнейшай – беларускія клубы "Нёман", "Палімір" (Наваполацк), жлобінская "Белсталь" і латвійская каманда "Юнiёрс" (Рыга).

**КАНЬКАБЕЖНЫ СПОРТ**

У Херэнвене (Галандыя) абсалютнымі чэмпіёнамі Еўропы сталі Гундэ Німан (Германія) – сёмы раз і галандзец Рынцье Рытсма – трэці.

**НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС**

Усе чатыры беларускія тэнісісты (сёстры Паўловіч, Лагацкая і Шчаціна) выступілі без поспеху на адборачным алімпійскім турніры ў Манчэстары (Англія).

**ВОДНАЕ ПОЛА**

Такі ж лёс напаткаў у Францыі і беларускіх ватэрпалістаў. Яны прайгралі тры матчы з чатырох.

**ХАКЕЙ НА ТРАВЕ**

Відаць, тое ж чакае і "летніх" хакеістаў, якія саступілі супернікам па алімпійскіх адборачных спаборніцтвах першыя два матчы – 1:3 і 0:2.

**ТЭНІС**

У Мельбурне працягваецца першы з турніраў "Вялікага шлема" - Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Гэты турнір багаты на сенсацыі. Самая вялікая – параза першай ракеткі свету Піта Сампраса (ЗША), якую ён атрымаў ад 19-гадовага Марка Філіпаўсіса (Аўсталія). Не змог патрапіць нават у чвэрцьфінал трэці тэнісіст планеты аўстрыец Томас Мустэр. Яго перамог малады швед Мікаэль Цілстром. Не дайшлі да вырашальных баёў паўднёваафрыканец Ферэйра (9), харват Іванішавіч (10). Сярод жанчын ужо выбылі з барацьбы леташняя чэмпіёнка Аўстраліі Мары П'ерс (Францыя), японка Кіліка Датэ (5), Габрыэла Сабаціні (Аргенціна) – 6, беларуска Наталля Зверава (12). Калі ў жанчын усе зараней адзінагалосна аддаюць пальму першынства Моніцы Сэлеш (1), то ў мужчын прагнозы не такія адназначныя. Агасі (2) і Бекер (4), якія выйшлі на першы план, гуляюць з натугай. Можа, Майкл Чанг нарэшце выйдзе з ценю? Ці расіянін Кафельнікаў? Хутка даведаемся.

А ў нас у Мінску – свой чэмпіянат, і таксама адкрыты. Сярод жанчын у фінале тытул чэмпіёнкі Беларусі заваявала мінчанка Вера Жукавец, а сярод мужчын – мінчанін Аляксандр Швец. Яшчэ раз яны сталі чэмпіёнамі у парным разрадзе: Жукавец – разам са Святланай Комлевай з Малдовы, Швец – з Уладзімірам Ваўчковым.

**ШАХМАТЫ**

Наш зямляк Барыс Гельфанд на турніры ў Вейк-ан-Зээ (Галандыя) згуляў унічыю. Усе шэсць партыяў ён закончыў з сўпернікам мірна і мае 3 ачкі – гэта сёмы паказнік. На ачко больш – у лідэраў: Васіля Іванчука (Украіна), Аляксея Дрэева і Сяргея Цівякова (Расія), Івана Сакалова (Боснія і Герцагавіна). Да канца спаборніцтва засталося 7 тураў.

**ФУТБОЛ**

У ЗША праходзіць Кубак краінаў Паўночнай і Цэнтральнай Амерыкі. У паўфіналах чэмпіёны свету бразільцы, якія гуляюць па-за конкурсам, абыгралі гаспадароў – 1:0, а Мексіка – з такім жа лікам – Гватэмалу. У фінале зборная Мексікі была мацнейшаю за каманду Бразіліі, якая, праўда, выступала ў маладзёжным складзе – 2:0. Амерыканцы ў барацьбе за трэцяе месца разграмілі гватэмальцаў – 3:0.

Паўабаронца мінскага "Дынама" і зборнай Беларусі Уладзімір Журавель цяпер будзе гуляць у Ізраілі за клуб другой лігі "Хапаэль" (Іерусалім).

**ФУТЗАЛ**

Футзалісты "Энергетыка" з Новалукомля выйгралі Кубак Беларусі, перамогшы ў фінале "Альпіну" (Гатава).

**ХРОНІКА**

Выдатны амерыканскі баксёр, шматразовы чэмпіён свету сярод профі, алімпійскі чэмпіён 1960 года Махамед Алі прыбыў на Кубу з грузам гуманітарнай дапамогі вагою 3 тоны. Яго суспракаў другі выдатны майстра, трохразовы пераможца Алімпіяд 1972–80 гадоў кубінец Тэафіла Сціівенсан. 44-гадовы Тэафіла на 10 гадоў маладзейшы за Алі. Атлеты, якія ніколі раней не сустракаліся на рынгу, пасябравалі па-за яго межамі.

Памерла Зоя Францаўна Бальшакова, заслужаны майстра спорту, заслужаны трэнер СССР і Беларусі па веласіпедным і канькабежным спорце.

**Падрыхтаваў Сямён ПЛОЦ**

# Як заўжды, толькі горш

*У мінулую пятніцу ў мінскім Альтэрнатыўным тэатры праходзіла «Рок-каранацыя'95»*

Першае ўражанне: людзі прывыкаюць не толькі да добрага, але і да кепскага. Беларуская рок-тусоўка ўжо не звяртае ўвагі на дрэнны гук, на нізкапробнае шоў, на мешаніну музычных і відовішчных жанраў, сярод якіх уласна рок-н-рол займае зусім не галоўнае месца. Арыгінальныя гурты выступалі ў адных намінацыях з англа-рускамоўнымі гуртамі-калькамі. Дзяўчаты ў купальніках старанна падымалі нагу. Падмалоджаны чыноўнік прэзідэнцкай тэлевізіі Сямашка нагадваў канферанса заштатнага вар'етэ. Каб "адвязацца", рок-н-ролу было замала, а гарэлку не раздавалі.

Першае месца заняў парадыйны гурт "Рублёвая зона" – каманда з другога ці трэцяга эшалону шоў-бізнэса. Караналі вакаліста гэтага гурта "Джагера". Як заўважыў нехта з прысутных, беларускі рок-кароль цяпер цалкам адлавядае беларускаму прэзідэнту – усё другаснае цяпер у пашане. Несапраўдныя прызы (напрыклад, набор аўтаручак Лявону Вольскаму – за лепшы тэкст), фальшывы сцэнар (ніхто так і не даведаўся, з якога спісу журы выбірала намінантаў і чаму), дый самі намінацыі – бляклыя і невыразныя. Напрыклад, "за вернасць жанру" быў адзначаны "Палац", які, як заўжды "пад фанеру", даказваў, што калі ты спяваеш фальклор, то які гэта фальклор – беларускі ці лаціна-амерыканскі – не так ужо істотна. "Рок-княгіняй" зноў стала Кася Камоцкая. "Уліс" быў моцна раздражнёны тым, што дазволілі праспяваць толькі адну песню (спяваў сам Корань). Як заўжды ратавалі гонар беларускага рок-н-ролу "Крама" і "Народная Рэспубліка Мроя".

Усё было як заўжды, толькі горш. Ва ўсім адчуваўся дух занападу і дэградацыі. Праўда, тусоўка была і гусавалася. А гэта для яе, тусоўкі, галоўнае.

**Прысутны**

Падпісны індэкс 63887 E-mail:edit@svaboda.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 45.000 (1-шы завод – 40.000 )
Нумар падпісаны ў друк 22.01.96 (15.00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 10 Заказ 218

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010